Фарыд Закарыя



...Арабскі сьвет — гэта палітычная пустыня,
дзе няма ні сапраўдных
палітычных партыяў, ні вольнага друку...

# Карані гневу

*Пераклад з ангельскай і падрыхтоўка да друку Міколы Іванова, Віталя Цыганкова і Сяргея Шупы.*

***«Нашто ж на зямлі сваркі і звадкі, боль і горыч, калі мы ўсе разам ляцім да зор?» — геніяльнае пытаньне-запавет геніяльнага Максіма Багдановіча. Але ці пачулі мы яго, ці асэнсавалі? Ці цікавімся мы ўвогуле — чым і як жывуць нашыя суседзі, што хвалюе сьвет сёньня? Глабалізацыя?.. Аб'яднаньне Еўропы?.. Сусьветны тэрарызм?.. Глабальнае пацяпленьне?.. Экалогія душы?.. Куды там, калі ў беларусаў мільён сваіх праблемаў: Чарнобыль, захаваньне мовы, культуры, незалежнасьці... Але — нельга сёньня замыкацца ў сваёй нацыянальнай кватэры, нельга жыць па прынцыпе «мая хата з краю». І таму рубрыка «СЬВЕТ» стане пастаяннай у нашым літаратурна-мастацкім выданьні.***

***Дык што ж трывожыць сёньня жыхароў планеты Зямля? Пасьля мінулагодняга 11 верасьня для многіх людзей гэтае пытаньне стала рытарычным. Зразумела, чаму першай нашай публікацыяй стаў артыкул амерыканскага палітолага Фарыда Закарыя, які дае свае адказы на пытаньні: «Чаму адбылася трагедыя 11 верасьня?», «У чым карані ісламскага фундаменталізму?», «Чым Амерыка і Захад увогуле могуць дапамагчы мусульманскаму сьвету?»***

## I

Сучасная эпоха ў арабскім сьвеце распачалася з прыходам да ўлады ў Егіпце пад канец 50-х гадоў Гамаль Абдэль Насэра. Стагоддзямі арабскія краіны кіраваліся каланіяльнымі губернатарамі і дэкадэнцкімі каралямі.

Выглядала, што Насэр будзе выратавальнікам арабскага сьвету.

Ён нарадзіўся за часамі брытанскага панаваньня ў Александрыі, касмапалітычным горадзе, які быў больш міжземнаморскі, чымся арабскі. Гады свайго сталеньня ён правёў у арміі, якая была найбольш эмансіпаваным элементам грамадства.

Насэр лічыў, што арабскі сьвет павінен быць рэфармаваны з дапамогай такіх заходніх ідэяў, як самавызначэньне, сацыялізм і арабскае адзінства. І перад тым, як нафтадаляры ператварылі краіны Пэрсыдзкай затокі ў «залатых гусак», Егіпет быў бясспрэчным лідэрам Блізкага Усходу.

Здавалася, што ідэі Насэра дапамогуць арабскім краінам рэфармавацца. Здарылася, аднак, інакш. Ідэі гэтыя ажыцьцяўляліся найгоршым спосабам. Сацыялізм прывёў да бюракратыі і застою. Арабскія рэспублікі ператварыліся ў дыктатуры. Рух «недалучаных дзяржаваў» у сапраўднасьці быў толькі інструментам савецкай прапаганды.

Арабскае адзінства ня спраўдзілася, як толькі паасобныя краіны пачалі адчуваць свае ўласныя нацыянальныя інтарэсы. Ізраіль двойчы моцна зьняважыў арабаў у войнах 1967 і 1973 гг. А калі Садам Хусэйн захапіў Кувейт у 1990 годзе, ён зьнішчыў рэшткі арабскай ідэі.

Зьвернем увагу на сёньняшні Егіпет. Абяцаньні Насэра ператварыліся ў сапраўдны кашмар. Урад эфэктыўны толькі ў адной галіне: здушэньні дысыдэнцтва і запалохваньні грамадзянскай супольнасьці. На працягу апошніх 30 гадоў ягоная эканоміка разыходзіцца па швах, а колькасьць насельніцтва павялічылася ўдвая. Беспрацоў'е на ўзроўні 25%, а 90% тых, хто шукае працу, маюць дыпломы вышэйшай адукацыі. Некалі Егіпет быў цэнтрам арабскага інтэлектуальнага жыцьця, а цяпер у краіне друкуецца ўсяго 375 кніжак на год. (У Ізраілі, дзеля параўнаньня, 4000).

Але Егіпет яшчэ выглядае лепш, чымся ягоныя арабскія суседзі. Сірыя – адна з найбольш рэпрэсіўных паліцэйскіх дзяржаваў у сьвеце, краіна, дзе 25 тысячаў чалавек могуць быць затрыманыя і забітыя рэжымам без аніякіх наступстваў.

Ірак на працягу апошніх 30 гадоў прайшоў шлях ад адной з найбольш мадэрнізаваных і сьвецкіх арабскіх краінаў, дзе жанчыны працавалі, разьвівалася мастацтва і існавала незалежная журналістыка, да ўбогай сцэны, дзе адбываецца сьпектакль мегаламаніі Садама Хусэйна.

Ліван, разнастайнае касмапалітычнае грамадства са сталіцай Бейрут, які раней называлі Парыжам Усходу, ператварыўся ў пекла вайны і тэрору.

Адбылося амаль неверагоднае, ледзь ня кожная арабская краіна сёньня менш свабодная, чымся 30 гадоў таму. На сьвеце вельмі мала краінаў, пра якія можна сказаць падобнае.

У 70-я гады на Блізкі Усход прыйшлі вялікія грошы. Здавалася, што калі насэрызм прайграў, нафтадаляры павінны дапамагчы ў ажыцьцяўленьні надзеяў арабскага сьвету. Але і тут арабскі сьвет чакала новая параза.

Нафтадаляры прывялі да стварэньня групы надзвычай багатых арабскіх краінаў, валадары якіх падарожнічаюць па сьвеце і зьдзіўляюць усіх раскошай. Іх ненавідзіць рэшта арабскага сьвету.

Бальшыня амэрыканцаў лічыць, што арабы павінны быць удзячныя за тую ролю, якую амэрыканцы адыгралі ў вайне ў Пэрсыдзкай затоцы, за выратаваньне Кувейту і Саудаўскай Арабіі. Але ў сапраўднасьці бальшыня арабаў лічыць, што ЗША ратавалі кувейцкія і саудаўскія каралеўскія сем'і.

Саудаўская Арабія – гэта былое бэдуінскае грамадства, у якім людзі адчуваюць сябе, як у паасобных клетках. Перапоўненыя расчараваньнем, гарэччу і пазбаўленыя ілюзіяў некаторыя маладыя людзі цяпер жывуць у Афганістане і супрацоўнічаюць з Усамам бін Ладэнам. Сам бін Ладэн і некаторыя з яго памагатых паходзяць з арыстакратычных саудаўскіх сем'яў.

## II

У сярэднявеччы арабскія навукоўцы вывучалі Арыстоцеля, яны прыдумалі альгебру. Нават у XIX стагоддзі арабская

інтэлектуальная эліта знаходзілася пад уплывам заходніх ідэяў. Калі цяпер чытаеш падрыхтаваную Насэрам «нацыянальную Хартыю» 1962 году, складаецца ўражаньне, што яе падрыхтавалі парыжскія левыя інтэлектуалы. Насэр спадзяваўся, што ідэя нацыянальнага адзінства арабаў адыграе ў арабскім сьвеце такую самую ролю, як нямецкая ці італьянская нацыянальныя ідэі падчас аб’яднаньня Нямеччыны ці Італіі. Тыя, што гавораць на адной мове, ствараюць адзіную нацыю. Здарылася, аднак, інакш.

Імпартаваць заходнія вырабы («кадылакі», «макдональды» і «гальфстрымы») было значна лягчэйшай справай, чымся імпартаваць заходнія ідэі (свабодны рынак, дэмакратыя, палітычныя партыі, празрыстасьць грамадскага жыцьця і законнасьць).

Улады багатых краінаў Пэрсідскай затокі падпісалі са сваімі народамі няпісанае пагадненьне: мы забясьпечваем вам высокі ўзровень жыцьця, а вы аддаяце нам уладу. Гэта як бы прачытаны наадварот галоўны лозунг амэрыканскай рэвалюцыі: без падаткаў, але і без грамадскага прадстаўніцтва.

Арабскія грамадствы закрытыя, і таму іх амаль не закранае глябалізацыя. Арабы могуць глядзець на глябалізацыю, але яны ня ўдзельнічаюць у ёй.

Арабскія супольнасьці перажываюць цяпер моцны дэмаграфічны выбух. Амаль палова насельніцтва арабскіх краінаў – гэта людзі маладзейшыя за 25 гадоў. Гэта людзі значна лепш адукаваныя, чымся іх бацькі. Яны накіроўваюцца ў вялікія гарады (Каір, Бейрут, Дамаск) у пошуках працы. У гэтым новым сьвеце яны бачаць выразны падзел у маёмасным стане.

Яны шукаюць адказаў на шматлікія пытаньні і не знаходзяць іх. У мінулым падобныя сітуацыі прыводзілі да рэвалюцыяў. У арабскім жа сьвеце гэта прывяло да ісламскага адраджэньня.

## III

Гамаль Абдэль Насэр быў памяркоўна набожным мусульманінам, аднак ён быў нясхільны блытаць рэлігію з палітыкай. Для яго гэта было б нібы павярнуць час назад. Гэта заўважылі малыя ісламскія партыі, які дапамагалі Насэру прыйсьці да ўлады. Найважнейшая з іх – Мусульманскае Брацтва – пачала энэргічна і часта гвалтоўна яму супрацiўляцца. Насэр разграміў яе ў 1954 годзе, зьняволіўшы каля тысячы яе прыхільнікаў, а шасьцёх пакараўшы сьмерцю. Адзін са зьняволеных, Саід Кутуб, кволы чалавек з палымяным пяром, напісаў у турме кнігу пад назовам «Вехі на дарозе», з якой у пэўным сэнсе пачалася гісторыя сучаснага палітычнага Ісламу – таго, што часта называюць «ісламскім фундаменталізмам». У сваёй кнізе Кутуб асудзіў Насэра як бязбожніка, а ягоны рэжым – як антыісламскі. Мала таго, – працягваў ён, – амаль кожны сучасны арабскі рэжым мае падобныя заганы. Кутуб уявіў сабе лепшую, больш набожную палітычную сістэму, заснаваную на строгіх ісламскіх прынцыпах – якая была галоўнай мэтай артадаксальных мусульманаў яшчэ ад канца XIX стагоддзя. Па меры таго, як у пасьлянасэраўскія дзесяцігоддзі блізкаўсходнія рэжымы рабіліся штораз больш далёкія ад таго ідэалу, штораз больш жорсткія і крывадушныя, расла прывабнасьць фундаменталізму. Ён квітнеў, бо Мусульманскае Брацтва і падобныя арганізацыі прынамсі спрабавалі даць людзям адчуваньне нейкага сэнсу, нейкай мэты ў зьменлівым часе – тое, чаго не спрабаваў рабіць ніводзін дзяржаўны кіраўнік на Блізкім Усходзе.

З гэтай прычыны Іслам амаль ня мае канкурэнтаў. Арабскі сьвет – гэта палітычная пустыня, дзе няма ні сапраўдных палітычных партыяў, ні вольнага друку, і вельмі мала шляхоў дзеля іншадумства. У выніку мячэць ператварылася ў месца палітычных дыскусіяў. І фундаменталісцкія арганізацыі не абмяжоўваюцца аднымі дыскусіямі. Ад Мусульманскага Брацтва да Хамасу і Хізбулы яны актыўна аказваюць сацыяльную і медычную дапамогу, кансультуюць у розных пытаньнях і даюць часовы прытулак. Тыя, каму дарагая грамадзянская супольнасьць, з трывогай заўважаюць, што на Блізкім Усходзе гэтыя антыліберальныя групы – і ёсьць грамадзянская супольнасьць.

Ісламскі фундаменталізм атрымаў магутны імпульс у 1979 годзе, калі Аятала

Рухала Хамейні скінуў іранскага Шаха. Іранская рэвалюцыя прадэманстравала, што магутнага лідэра могуць вылучыць і пэўныя сацыяльныя групы. Яна таксама засьведчыла, як у ненармальным грамадстве нават здавалася б такія пазітыўныя сілы прагрэсу, як адукацыя і тэхналогія, могуць прычыніцца да стварэньня бязладу. Да 70-х гадоў XX стагоддзя бальшыня мусульманаў на Блізкім Усходзе былі непісьменныя і жылі ў вёсках і мястэчках. Яны вызнавалі свайго роду «вулічны іслам», прыстасаваны да мясцовай культуры. Прасякнутыя плюралізмам і талерантнасьцю, гэтыя людзі часта пакланяліся сьвятым, наведвалі сьвятыні, сьпявалі рэлігійныя гімны і любілі рэлігійнае мастацтва – усё гэта ў прынцыпе не дазваляеццаІсламам. (Прынамсі так было ў Іране.) У 70-х гадах, аднак, людзі пачалі перабірацца з вёсак у гарады і іхні рэлігійны досьвед перастаў быць прывязаным да канкрэтнага месца. У тым самым часе яны вучыліся чытаць і раптам адкрылі для сябе зусім новы Іслам, які прапаведвалі фундаменталісты – гэта была абстрактная вера, заснаваная не на гістарычным досьведзе, а на літаральным, пурытанскім разуменьні Карану.

У гэтай атмасферы інтэлектуалы, расчараваныя недапечанай або звышхуткай мадэрнізацыяй, якая прынесла ў іхні сьвет бязладдзе, пачалі пісаць кнігі супраць «заходняй атруты». Такія людзі, пішучы ў камфорце сваіх лонданскіх або парыжскіх кабінетаў, крытыкуюць амерыканскі сэкулярызм і спажывецтва і падтрымваюць ісламскую альтэрнатыву. І такія тэорыі, разыходзячыся па арабскім сьвеце, знаходзілі водгук ня ў бедных пластах, для каго мадэрнізацыя – гэта чэраўны рай з ежай і лекамі. Імі прасякаліся нядаўчаныя натоўпы, што траплялі ў гарады Блізкага Усходу або шукалі адукацыі і працы на Захадзе.

Аднак галоўная прычына росту ісламскага фундаменталізму палягае ў поўным правале ў арабскім сьвеце палітычных інстытуцыяў. Мусульманскія эліты адвярнулі вочы ад гэтай рэальнасьці. Розныя канферэнцыі будуць хутчэй абмяркоўваць праблемы накшталт «Іслам і асяроддзе», чым вывучаць прычыны нядзейснасьці цяперашніх рэжымаў. Аднак пакуль памяркоўная большасьць глядзіць у другі бок, Іслам узурпуе малы атрутны элемент – людзі, якія выступаюць за жорсткае абыходжаньне з жанчынамі, ненавідзяць адукацыю, эканоміку і наогул сучаснае жыцьцё.

Цяпер мы падыходзім да пытаньня – чым Злучаныя Штаты могуць дапамагчы Ісламскаму сьвету. Аднак, калі самі мусульмане ня зробяць нешта, каб не аддаць сваю рэлігію на волю сярэднявечных цемрашалаў, ніякая дапамога звонку іх не ўратуе.

## IV

Амаль кожны араб можа тут рашуча запярэчыць. «Добра гаварыць пра няўдачы арабскага сьвету, але як наконт правалу Захаду? Вы гаворыце пра доўгатэрміновы крызіс, але на самой справе корань арабскіх праблемаў палягае ў абмежаванай і жорсткай амерыканскай палітыцы». Сапраўды, для большасьці арабаў стасункі са Злучанымі Штатамі перапоўненыя падманутымі спадзяваньнямі.

Арабскі сьвет даволі даўно лічыць, што еўрапейскія каланіяльныя дзяржавы яму здрадзілі. Што да расчараваньня Амерыкай, то яно пачалося са стварэньнем дзяржавы Ізраіль у 1948 годзе. Злосьць і разьюшанасьць яшчэ больш паглыбілася ў выніку амерыканскай падтрымкі Ізраіля падчас войнаў у 1967 і 1973 гадах. Штодзённае панаваньне ізраільскай палітыкі жалезнага кулака на акупаваных палестынскіх тэрыторыях узмацніла такія настроі.

Паўсюль арабы разглядалі амерыканскую палітыку ў рэгіёне як цынічную і накіраваную на падтрымку ўласных нафтавых інтарэсаў, на падтрымку бандытаў і тыранаў. Нарэшце, бамбаваньні ды ізаляцыя Іраку стала яшчэ адной прычынай для штодзённай крытыкі ЗША. Хаця многія ў арабскім сьвеце ня любяць Хусэйна, яны лічаць, што ЗША выбралі самы антыгуманны спосаб барацьбы зь ім – спосаб, які пакідае галадаць цэлы народ.

Магчыма, самы вялікі грэх ЗША ў дачыненьні да арабскага сьвету – гэта грэх бязьдзеяньня ды ігнараваньня. Амерыка была занадта бесклапотнай у сваёй арабскай палітыцы.

Але толькі бесклапотнасцю ЗША ня можна патлумачыць гнеў арабаў. Неадэкватнае пачуцьцё крыўды на амэрыканцаў павінна быць разгледжанае з пункту гледзішча таго пачуцьця прыніжэньня, упадку ды адчаю, што ахапіла арабскі сьвет. Напрыклад, кітайцы таксама рашуча нязгодныя з амерыканскай замежнай палітыкай, афрыканцы маюць ня меншае пачуцьцё расчараваньня і несправядлівасьці. Але яны не выказваюць такі гнеў супраць Амерыкі.

Арабы, аднак, адчуваюць сябе нібыта ў аблозе варожага да іх сучаснага сьвету і што менавіта ЗША сымбалізуюць гэты сьвет. Таму нават калі Амерыка нічога ня робіць, чуткі пра ейныя подлыя і гнюсныя справы не зьнікаюць. Амерыканцы ня могуць сабе ўявіць, наколькі распаўсюджанае ў арабскім сьвеце меркаваньне, што менавіта ЦРУ і Масад узарвалі Усясьветны гандлёвы цэнтр, каб апраўдаць напад на мусульманаў ды арабаў. Гэта культура, з якой паходзяць тэрарысты-сьмяротнікі.

Амерыка зараз мусіць распрацаваць стратэгію вайны з рэлігійным тэрарызмам. Вайны на ваенным, палітычным ды культурным франтах. На ваенным фронце мэта даволі відавочная – поўнае зьнішчэньне тэрарыстычнай арганізацыі Аль Каіда. Кожны чалавек альбо арганізацыя, якая плануе дапамагаць тэрарыстам, мусіць зразумець, што яго абавязкова высачаць і схопяць.

Палітычная стратэгія больш комплексная і глыбокая. Калі казаць шырока, ЗША мае шанец перабудаваць міжнародную сістэму пад націскам новай пагрозы. Узровень супрацоўніцтва па ўсім сьвеце пасьля 11 верасьня стаў беспрэцэдэнтны. Большасьць урадаў, нават тыя, якія падтрымлівалі тэрарызм у мінулым, бачаць небясьпеку ў існаваньні такіх міжнацыянальных тэрарыстычных груповак, як Аль Каіда.

ЗША маюць пільную патрэбу ў сталым супрацоўніцтве з іншымі краінамі – каб арыштоўваць тэрарыстаў, выкрываць іхнія схованкі, закрываць банкаўскія рахункі і дзяліцца выведнай інфармацыяй.

Цяпер пра праблему Ізраілю – відавочна самае складанае пытаньне ў рэгіёне. ЗША ня можа аслабіць сваю прыхільнасьць да існаваньня і дабрабыту Ізраілю. Аднак павінна быць праведзеная выразная рыса паміж правам Ізраілю на існаваньне і ягонай акупацыяй Заходняга берагу і Паласы Газа. Ізраіль ня можа заставацца дэмакратычнай краінай і адначасова ваеннай сілай кіраваць на акупаваных тэрыторыях трыма мільёнамі чалавек насуперак іхняй волі. Гэта дрэнна для Ізраіля, дрэнна для палестынцаў, дрэнна для Злучаных Штатаў.

Трэці, і самы жыцьцёва важны кампанент бітвы, – гэта культурны фронт. ЗША павінны дапамагчы ісламу ўвайсьці ў сучасны сьвет. Амерыка стаіць перад тварам такой злавеснай пагрозы, якая ня можа быць разьвязаная, пакуль ня спыніцца палітычны, эканамічны ды культурны заняпад арабскіх дзяржаваў, што ляжыць у падмурку арабскага гневу. Па-першае, трэба спрыяць зьмякчэньню арабскіх палітычных рэжымаў, вядома, пры ўмове, што яны гатовыя прыняць такую лібералізацыю. Надта доўга рэжымы накшталт Саудаўскай Аравіі былі ўцягнутыя ў сьмяротны танец з рэлігійным экстрэмізмам. Нават Егіпет, які заўсёды фармальна адмаўляў фундаменталізм, дазваляе сваім кантраляваным мэдыям распаляцца тырадамі супраць ЗША ды Ізраіля (пры гэтым, арабскія медыі маўчаць пра дыктатуры ў сваіх краінах).

Больш агульная задача – дапамагчы памяркоўным арабам даказаць сваім народам, што іслам сумяшчальны з сучасным грамадствам, што ён дазваляе жанчынам працаваць, заахвочвае адукацыю і вітае людзей іншых вераў і перакананьняў. Амерыка павінна фінансава дапамагаць памяркоўным мусульманскім групоўкам, навучальным цэнтрам і медыям, якія мысьляць па-сучаснаму. Усё гэта трэба рабіць з мэтай аслабіць сілу фундаменталістаў.

Калі Захад здолее дапамагчы Ісламу ўвайсьці ў сучасны сьвет з годнасьцю і мірам, гэта будзе больш чым дасягненьне бясьпекі. Гэта павінна зьмяніць сёньняшні сьвет.

*Часопіс «Newsweek»,*
*верасень 2001 г.*
*www.svaboda.org*